ДУК «Бібліятэчная сетка Хоцімскага раёна»
Вялікаліпаўская сельская бібліятэка

# «ЗЯМЛЯ МАЯ»

## Віртуальная выстава

Аўтар: Твердахлебава Анжаліка Іванаўна




**Зуёнак, С. В.** Земнаводныя. Паўзуны : успаміны пра забыты палёт : нарысы / Сяргей Зуёнак, Руслан Навіцкі, Сяргей Драбянкоў ; [распрацоўка С. У. Фядотавай ; мастак У. П. Свентахоўскі]. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2009. — 61, [2] с.

"Земнаводныя і паўзуны" – гэта захапляльны аповед трох аўтараў пра дзіўных жывых істот, людзі іх зазвычай не надта любіць, у міфалогіі і ў фальклоры розных народаў свету яны з'яўляюцца ў фантастычным абліччы, ім надаюцца надпрыродныя ўласціваcці

Кнігу адкрывае ўступны нарыс, дзе апавядаецца пра шматстайнасць земнаводных і паўзуноў, іх развіццё, а таксама пра шматстайнасць міфаў, прысвечаных гэтым істотам. Тут ёсць і пэўны філасофскі пункт гледжання, свайго кшталту "экалагічная эстэтыка", што прымушае перагледзіць некаторыя людскія стэрэатыпы.

**Чумакоў, Л. С.** Ракі. Малюскі. П'яўкі : таямнічыя жыхары вадаёмаў : нарысы / Леанід Чумакоў. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2007. — 67, [4] с. : каляр. іл. ; 27 см. — (Зямля мая).

Кніга распавядае аб тых жывёлінках, якіх , мабыць, хоць і сустракаем, але ведаем не вельмі добра. Звычайна мала хто звяртае на іх увагу. Некаторых, праўда заўважаем. Гэта малюскі ды п'яўкі. Затое іншых ці проста не бачым, ці нават і не здагадваемся, што гэта жывёліны. Дык вось, калі цікава даведацца пра іх, прачытай гэтую кніжку. І жывёльны свет вадаёмаў больш не будзе незнаёмым і загадкавым.






**Чумаков, Л.С.** Насякомыя : шасціногія суседзі : нарысы / Леанід Чумакоў. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2005. — 50, [5] с. ; 27 см. — (Зямля мая).

Добры чытач, узяўшы гэтую кніжку ў рукі, ты пазнаёмішся з цудоўным светам нашых шасціногіх суседзяў – з матылямі і стракозамі, рознымі жукамі і мухамі, конікамі і тараканамі. Ты будзеш ведаць, якімі маленькімі ці вялікімі яны бываюць, што ядуць, як хаваюцца ад іншых жывёлін, як хутка лятаюць ці бегаюць. Даведаешся і пра тое, як яны арыентуюцца ў навакольным асяроддзі і як даюць нам магчымасць ведаць, напрыклад, аб тым, якое будзе надвор'е. Разам з гэтым ты даведаешся аб некаторых насякомых, якіх, напэўна, неаднойчы бачыў у лесе, на лузе ці каля ракі; пазнаёмішся і з тымі казяўкамі, якім патрэбна наша дапамога. Ну што, згодны? Калі так, то чытай далей.

**Зубей, А. У.** Рыбы : калі рэкі беглі вольна... : нарысы / Аляксандр Зубей ; [мастак У. П. Свентахоўскі]. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2005. — 45, [2] с. ; 27 см. — (Зямля мая).

**У гэтай кнізе аўтар расказа аб прахадных рыбах, экалагічнай групе рыб, якая адрозніваецца асаблівасцю міграцый, звязаных з размнажэннем**

**.**






**Бардон, У. Я.** Мінералы. Горныя пароды. Метэарыты : у свеце беларускага каменя : нарысы : [пераклад з рускай мовы] / Усевалад Бардон ; [мастак У. П. Свентахоўскі]. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2011. — 68, [3] с. : каляр. іл. ; 27 см. — (Зямля мая).

У гэтай кнізе аўтар хоча паказаць чытачу незвычайнае ў звычайным, штодзённым, бо дзівосы ў царстве мінералаў-побач.

Аўтар спадзяецца, што ў гэтым вам дапамогуць нарысы пра камяні, што атачаюць нас, змяняючы адзін аднаго, нібы ў калейдаскопе.

**Скуратовіч, А. М.** Расліны : зяленае падарожжа : нарысы / Аркадзь Скуратовіч ; мастак У. П. Свентахоўскі ; падбор фотаздымкаў А. М. Скуратовіч. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2004. — 59, [4] с. — (Зямля мая).

**У кожнага з нас ёсць мясціны, дзе заўважаеш прыгажосць першай кветкі, хараство бярозавага гаю.**

**Гэта кніга выклікае цікавасць да незвычайнага і цудоўнага свету раслін. З яе вы даведаецеся пра цікавы свет беларускіх раслін — пра лекавыя расліны, пра расліны-драпежнікі, а так сама пра тыя, што занесены ў Чырвоную кнігу Беларусі.**

**Веды якія ты захаваеш на працягу ўсяго жыцця, чым бы ні займаўся ў будучым.**






**Зуёнак, С. В.** Птушкі : Крылатая песня Зямлі : нарысы / Сяргей Зуёнак ; [мастак У. П. Свентахоўскі]. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2004. — 58, [5] с. ; 27 см. — (Зямля мая).

«Птушкі» – кніга распавядае аб тым што, з усяго цудоўнага і разнастайнага свету прыроды- звяроў, паўзуноў, рыб, бесхрыбетных- словам, усяго, што складае жывы элемент навакольнага асяродзя, самымі прыметнымі з’яўляюцца, вядома ж, птушкі. Іх можна сустрэць паўсюду- у полі, на лузе, у лесе, у вёсцы, у горадзе, дзе яны часам жывуць нават у самых, на першы погляд, непрыгодных для гэтага мясцін.

**Шапарава, Я. А.** Грыбы : вялікая таямніца прыроды : нарысы / Ядвіга Шапарава ; [фота : М. Р.Дзмітранок і інш.]. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2006. — 52, [3] с. ; 27 см. — (Зямля мая).

На старонках гэтай кнігі вы разгледзіце самыя агульныя пытанні мікалогіі, пазнаёміцеся з асобнымі прадстаўнікамі таямнічага свету грыбоў.

І вось каб бліжэй пазнаёміцца з такім блізкім і загадкавым светам, гэта кніга прапануе вам дзівоснае падарожжа па краіне мікалогія, якая займаецца вывучэннем грыбоў.





**Наварыч, А.** Звяры : Сустрэчы з прыродай : эцюды / Алесь Наварыч ; [мастакі : У. П. Свентахоўскі, Г. А. Кобрын]. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2004. — 45, [2] с. ; 27 см. — (Зямля мая).




Па старонках кнігі: «Звяры», чытач пазнае, што, 225 мільёнаў гадоў назад на Зямлі, сярод дыназаўраў, якія панавалі ў небе, на сушы і ў вадзе, з’явіліся першыя млекакормячыя.

Млекакормячыя засялілі ўсю Зямлю, усе кліматычныя паясы: экватар, тропікі, субтропікі і ўмераныя паясы.

Аб тым, што, звяры заваявалі горы і пустыні, стэпі і балоты і нават пакарылі моры і акіяны. Бо яны не баяліся холаду і нават пры абледзяненнях, якія час ад часу даходзілі і да тэрыторыі нашай краіны.

# Дзякуй за ўвагу!